*УДК 378:069.1*

# ФАРМІРАВАННЕ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ СТУДЭНТАЎ ПЕДАГАГІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ СРОДКАМІ МУЗЕЯ

**С. Д. Грынько**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Э. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь, s.grinko@inbox.ru*

У артыкуле асвятляецца праблема фарміравання каштоўнасных арыентацый студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей як прадстаўнікоў будучай сацыяльна значымай прафесіі, што з'яўляецца актуальным у сучасным постындустрыяльным грамадстве. Праводзіцца аналіз і ўзаемасувязь паняццяў «каштоўнасць» і «каштоўнасная арыентацыя», актуалізуецца важнасць гэтых асобасных утварэнняў для будучых педагогаў. У якасці аптымізацыі адукацыйнага працэсу разглядаецца выкарыстанне сродкаў музея, якія дазваляюць засвойваць матэрыял на гістарычнай аснове, фарміруючы ў навучэнцаў каштоўнасна-эстэтычныя адносіны да рэалій, якія звязваюцца з культурай і традыцыямі грамадства.

***Ключавыя словы:*** каштоўнасныя арыентацыі; каштоўнасці; студэнты педагагічных спецыяльнасцей; музей; музейна-педагагічная дзейнасць.

# FORMATION OF VALUE ORIENTATIONS OF TEACHING STUDENTS BY MEANS OF THE MUSEUM

**S. D. Grynko**

*Yanka Kupala State University of Grodno,*
*Ozheshko St., 22, 230023, Grodno, Belarus, s.grinko@inbox.ru*

The article highlights the problem of forming value orientations of students of pedagogical specialties as representatives of the future socially significant profession, which is relevant in today's post-industrial society. The analysis and interrelation of the concepts of «value» and «value orientation» is carried out, the importance of these personality formations for future teachers is actualized. The use of museum facilities is considered as an optimization of the educational process, which allows learning material on a historical basis, forming value-aesthetic attitudes to realities that are connected with the culture and traditions of society in students.

***Key words***: value orientations; values; students of pedagogical specialties; museum; museum-pedagogical activity.

У перыяд грамадскіх трансфармацый, актыўнага ўзаемадзеяння чалавека і соцыума для эфектыўнай сацыялізацыі і дасягнення поспеху

асобе неабходна адпаведным чынам мадэляваць паводзіны. Усё гэта, безумоўна, уплывае на сістэму каштоўнасцей асобы, якая павінна засноўвацца найперш на набытках духоўнай культуры. Згодна аднаму з прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь адукацыя «павінна быць арыентавана на агульначалавечыя каштоўнасці, правы чалавека, мець гуманістычны характар» [1, с. 9]. На думку М. І. Мартынава, тэрмін «каштоўнасць», які шырока выкарыстоўваецца ў філасофіі і сацыялогіі для ўказання на чалавечае, сацыяльнае і культурнае значэнне пэўных з'яў рэчаіснасці, раскрывае асаблівы аспект адносін чалавека да свету, які дазваляе глыбей зразумець спецыфіку сацыяльнай дзейнасці, грамадства, культуры і з'яўляецца важным фактарам кансалідацыі людзей, іх інтэграцыі ў супольнасці [2, с. 133]. Каштоўнасці асобы індывідуальныя і ўнікальныя, так як выпрацоўваюцца на працягу жыцця ў працэсе ўзаемадзеяння чалавека з соцыумам і пад яго ўплывам. Засвоеная асобай канкрэтная, іерархічная сістэма сацыяльных каштоўнасцей вызначаецца навукоўцамі як «каштоўнасныя арыентацыі», зместавая сутнасць якіх заключаецца ў «наяўнасці ў чалавекам светапоглядных, палітычных і маральных пазіцый, пэўных прынцыпаў паводзін» [3, с. 19]. Гэта паняцце цесным чынам звязана з працэсам сацыялізацыі, прыняццем асобай грамадскіх запатрабаванняў і суаднясеннем іх з уласнымі патрэбнасцямі.

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый у студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей мае вельмі важнае значэнне для іх прафесійнай падрыхтоўкі. Гэтыя агульныя сэнсавыя асобасныя ўтварэнні, «рэгулююць і пераводзяць любы від дзейнасці (у тым ліку і прафесійны) у маральнасэнсавы план» [3, с. 29]. Пры авалоданні прафесіяй педагога вельмі важна, каб навучэнцы засвойвалі духоўныя каштоўнасці – прынцыпы і ідэі, якія абумоўліваюць стваральны і карысны для грамадска характар учынкаў чалавека.

Ветлівы, гуманны, добразычлівы настаўнік – прыклад для сваіх выхаванцаў. Аднак для эфектыўнай рэалізацыі адукацыйнага працэсу неабходна, каб ён быў заснаваны на ўзаемадзеянні і ўзаемаўзбагачэнні кожнага ўдзельніка, які мае права на самавыражэнне і свабоду творчасці. Таму вельмі важна ў студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей фарміраваць агульначалавечыя каштоўнасныя арыентацыі: «прыгажосць», «асоба», «радзіма», «зямля», «любоў». Гэта магчыма ажыццявіць, на наш погляд, шляхам далучэння навучэнцаў да найлепшых дасягненняў сусветнай і айчыннай культуры, гістарычнай спадчыны, нацыянальных традыцый.

Пашыраючы адукацыйную прастору шляхам супрацоўніцтва з музеем у адукацыйным працэсе, магчыма комплексна паўплываць на фарміраванне асобы студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей за кошт цэласнага наглядНага, эмацыйнага, інфармацыйнага і эстэтычнага ўздзеяння.

«Музей (лацінскае *museum* ад грэчаскага *museion* – храм муз) – культурная форма і сродак захавання, прэзентацыі і трансляцыі гістарычнай, культурнай і прыроднай спадчыны» [4]. У працэсе дэманстрацыі і інтэрпрэтацыі культурнай значнасці рарытэтных і знакавых у гісторыі прадметаў гэты сацыяльны інстытут рэалізуе адукацыйную функцыю, сістэмна і мэтазгодна выкарыстоўваючы экспазіцыю, асобныя прадметы, інфармацыю і нават само музейнае асяроддзе. Многааспектны ўплыў сродкаў музея заключаецца ў:

– фарміраванні светапогляду, духоўна-маральнай сферы навучэнца;

– грамадзянска-патрыятычным і эстэтычным выхаванні;

– развіцці пазнавальных інтарэсаў, эмацыйна-валявой сферы асобы;

– пашырэнні кругагляду за кошт новай, наглядна прадстаўленай інфармацыі;

– матывацыі да самаадукацыі і правядзення навукова-даследчай работы;

– фарміраванні сістэмы каштоўнасных арыентацый асобы, у якой выяўлены адносіны да матэрыяльнай і духоўнай культуры грамадства.

Такія ўнутрыасобасныя змены абумоўліваюць фарміраванне сістэмы каштоўнасных арыентацый, якія ўваходзяць у склад асобасных кампетэнцый – «комплексу навыкаў успрымання, суджэнняў і паводзін асобы, якія прызначаны забяспечыць яе эфектыўную інтэграцыю ў навакольны свет і выступаюць асновай для працэсу самавызначэння і самарэалізацыі» [5, с. 10].

Суаднесенасць каштоўнасных арыентацый і відаў асобасных кампетэнцый можна прадставіць наступным чынам:

– быццё і жыццё чалавека, навакольны свет (каштоўнасна-сэнсавыя кампетэнцыі);

– Айчына, правы грамадзяніна і абавязак, свабода і адказнасць, праца, пазнанне (грамадзянска-патрыятычныя кампетэнцыі);

– культура, духоўнасць, сям’я і яе традыцыі (культралагічныя кампетэнцыі);

– здаровы лад жыцця, свабода выбару (здароўезберагальныя кампетэнцыі);

– самаразвіццё, самарэгуляванне, рэфлексія, моўнае развіццё і родная мова (асобасна-развіццёвыя кампетэнцыі).

Сродкі музея арганічна спалучаюць у сабе гістарычны, індывідуальна-асобасны і сакральны сэнс, таму з’яўляюцца крыніцай для самапазнання і духоўнага развіцця асобы. Выкарыстанне іх у працэсе прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей «актуалізуе такі дыялог асобы з ідэаламі і вечнымі каштоўнасцямі культуры,

у якім чалавек знойдзе апору для самаразвіцця і самаўдасканалення ў хутка змяняльных умовах сучаснага свету» [6, с. 47].

Таму, на наш погляд, уключаючы сродкі «храма муз» у педагагічную дзейнасць выкладчыка (вучэбную, навукова-даследчую, выхаваўчую), можна пераадолець шэраг цяжкасцей у фарміраванні каштоўнасных арыентацый, якія ўваходзяць у склад асобасных кампетэнцый: недастатковыя веды аб сэнсавых сувязях паміж мінулымі і сучаснымі падзеямі; адсутнасць глыбокага разумення значэння набыткаў культуры грамадства, нацыі (уключаючы родную мову); нізкая ацэнка прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей ва ўзаемаадносінах з людзьмі; не сфарміраваныя каштоўнасныя адносіны да сучасных падзей, здаровага ладу жыцця і кожнага пражытага дня.

Гэта дасягаецца за кошт набыцця ведаў, уменняў, творчага вопыту ў музеі ў спалучэнні з каштоўнаснымі арыентацыямі, якія вызначаюць накіраванасць асобы на:

– шанаванне і захаванне памяці аб навакольным свеце, аб сабе і іншых людзях;

– эстэтычнае сузіранне, творчае ўяўленне;

– павагу да культуры свайго і іншых народаў.

Такім чынам, адукацыйны працэс з выкарыстаннем сродкаў музея якасна адрозніваецца ад традыцыйнай прадметна-цэнтрыраванай падрыхтоўкі студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей. Веды, якія атрымлівае навучэнец, маюць гістарычны кантэкст і заснаваны на каштоўнасных адносінах да рэалій, якія ацэньваюцца з пункту гледжання іх культурнага значэння.

Выкарыстанне ўздзеяння музея на наведвальніка ў асветніцкіх і выхаваўчых мэтах з’яўляецца сутнасцю музейна-педагагічнай дзейнасці, якая арганізуецца ў межах гэтай установы і выкарыстоўваецца выкладчыкам у адукацыйным працэсе як сродак яго аптымізацыі. У падрыхтоўцы студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей неабходна выкарыстоўваць метады работы музейнага педагога з наведвальнікамі (як у афлайн, так і анлайн фармаце), якія звязаны з аглядам экспазіцыі (інфармацыйны, прадуктыўны, рэпрадуктыўны, даследчы) і рэтраспекцыяй мінулага («пагружэнне» ў гістарычнае асяроддзе, ролевае «пражыванне» гістарычных падзей, рэканструкцыя) [7, с. 17–18], а таксама спалучаць традыцыйныя (гутарка, тлумачэнне, дэманстрацыя, праца з навуковай літаратурай і інш.) і інтэрактыўныя метады з розных груп паводле класіфікацыі С. С. Кашлева [8, с. 40–42]. Напрыклад, «Завяршы фразу» (з групы *метадаў стварэння спрыяльнай атмасферы і арганізацыі камунікацыі (узаемадзеяння)*), «Хвіліна гаварэння» (*метады арганізацыі сэнсатворчасці*), «Інтэрв’ю» (*метады арганізацыі абмену дзейнасцю),*

«Міні-сачыненне» (*метады арганізацыі рэфлексіўнай дзейнасці*) і г. д. Інтэграцыя розных спосабаў педагагічнага ўзаемадзеяння дазваляе аптымізаваць адукацыйны працэс пры супрацоўніцтве ўніверсітэта і музея, паспяхова ажыццяўляючы культурна-гістарычную інтэрпрэтацыю ведаў, што прадыктавана спецыфікай работы гэтай установы.

Такім чынам, за кошт сістэмнага выкарыстання сродкаў музея (з улікам комплекснага выкарыстання пералічаных метадаў) у падрыхтоўцы студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей дасягаецца фарміраванне каштоўнасных арыентацый, якія вызначаюць мэтавыя ўстаноўкі і змест актыўнасці асобы на аснове гістарычнай ацэнкі рэалій, а таксама іх культурнай і эстэтычнай значымасці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании. Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2022.

2. *Мартынаў М. І.* Філасофія : вучэбны дапаможнік. 2-е выд. Мінск : МІТСО , 2013.

3. *Асташова Н. А.* Учитель. Проблема выбора и формирование ценностей. М. : МПСИ, МОДЭК, 2000.

4. Словарь музейных терминов. Музей. // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. URL: http://www.museum.ru/RME/dictionary.asp?40 (дата обращения: 03.02.2023).

5. *Ядченко Е. М.* Формирование личностных компетенций студентов в процессе реализации воспитательной системы технического ССУЗ : автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.08; Учреждение Российской академии образования «Институт развития образовательных систем». Томск, 2009.

6. *Столяров Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика: учеб. пособие. М. : Высш. шк., 2004.

7. *Артемов Е. Г.* Музейно-педагогические технологии. Пособие-справочник. СПб. : ФГУК ГМ ПИР, 2006.

8. *Кашлев С. С.* Интерактивные методы обучения : учеб.-метод. Пособие. 2-е изд. Минск : ТетраСистемс, 2013.